*Воробей Даната Александровна*

**«Марыі Захарэвіч»**

Над хвалямі Мястры, над роднай старонкай
Гучыць мілагучны, пявучы і звонкі,
Як спеў салаўіны часінай начною,
Як звон ручаінак вясновай парою,
Гучыць мілагучны, святочны і ветлы,
Прываблівы голас жанчыны адметнай,
Якая свой талент, любоў - чым багата,
Кладзе на алтар, што завецца тэатр.
Яе гераіні – Паўлінка і Ганна,
Варвара, Наталля і Вольга таксама…
За многія іншыя ролі артысткі
Мы любім і цэнім, схіляемся нізка.
Чакалі на радыё мы пастановак,
Герояў Марыі, як лепшых сябровак.
Для кожнага стала яна нібы роднай,
Заслужана быць ёй артысткай народнай.
І сёння яна не бывае без справы
І радуе нас, як заўсёды, па праву.
І мы ганарымся сваёю Айчынай
У вобразе гэтай легенды-жанчыны.